ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda-weekly.org

№ 6 (281) 14 — 21 лютага 2003 г.

БЕЛОРУССКИЕ ВОПРОСЫ

СУРРОГАТ ФЕОДАЛИЗМА

АЛЕКСЕЙ МАКОВЕЦ

Растаскивание президентской вертикали на административные уделы — угроза, заложенная в основании белорусской системы власти.



НАШ ВЕРНИСАЖ. «Как приготовить яичницу, не разбив яиц», художник АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ-ДАЛИ

ВЕЧНАЯ ТЕМА

Не так давно, среди прочих насущных тем белорусского житья, официальные СМИ поминали коррупционную проблему. По белорусским каналам прошел официальный слух о должном ужесточении мер против должностных злоупотреблений.

Антикоррупционная борьба — тема из числа фундаментально белорусских. С нее начинал депутат Александр Лукашенко, с нею он и продолжает в роли президента.

Проблема чиновного своеволия насущна не только для рядового белоруса, от своеволия терпящего. Для самого верховного она злободневна не менее, а то и более.

В борьбе с бюрократическими вольностями белорусский президент провел кое-какую работу. Правда, административные преобразования велись прежде всего ради нужд режима белорусского.

Экспроприация госресурсов у старой партноменклатуры, строительство президентской вертикали власти. А в итоге 2003 год, среди прочего, начался с разговоров о надлежащем ужесточении антикоррупционной борьбы.

Выходит, труды по обузданию служилого сословия дали невпечатляющие результаты.

БЮРОКРАТИЧЕСКАЯ ВЛАСТЬ

Проблемы нецелевого использования ресурсов и полномочий госчиновниками спровоцированы самой системой власти в Беларуси. Специфика нашего гибридного режима — в сочетании весьма разнородных методов господства.

В Беларуси львиная доля собственности есть собственно государственной. И Беларусь не может быть чем-либо иным, кроме как государством бюрократическим.

Бюрократия же в своей основе есть система управления рациональная, наиболее эффективная при решении организационных целей. Она дегуманизирована, безлика и, в идеале, беспристрастна. Для нее характерны четкая формализация отношений, система писаных правил и предписаний, иерархия, построенная на основе этих правил, отбор персонала по способностям и техническим навыкам при гарантированной занятости и оплате.

Такова рациональная бюрократия в описании крестного отца социологии Макса Вебера. Власть бюрократа — в компетентности, нахождении оптимальных способов решения организационных задач, технической грамотности. Это инструментальная власть, ее лозунг — эффективность.

Сам Вебер понимал, что такой портрет бюрократии идеален. Но полезный эффект бюрократического аппарата определяется именно приближением реальных учреждений к этому идеальному типу.

Белорусская же управленческая реальность сильно не дотягивает до бюрократического идеала.

ЭРЗАЦ МОНАРХИИ

Как система административной власти бюрократия противостояла власти феодалов. В Европе Нового времени, добиваясь централизации, королевская власть опиралась именно на бюрократический аппарат. Чиновничество вербовалось из более низких социальных слоев как альтернатива системе традиционной княжеской власти.

Замена абсолютизма на конституционную монархию, или монархии на суррогат — президентскую республику, утвердили бюрократию в виде, наиболее близком веберовской схеме. Техническая власть аппарата, не формирующего конечные цели, но решающего задачи ради их достижения, росла параллельно усложнению социальной системы.

Но мягкий белорусский авторитаризм — явление неклассическое. Формально Беларусь — президентская республика. Полномочия главы государства как будто формализованы. Но так было и до 1996 года. Фактически же сегодня никто толком не скажет, что может себе позволить белорусский президент, а что — нет.

Беларусь — не монархия, и с традиционной легитимностью королей нельзя уподобить легитимность белорусского президента. Точно так же легитимность чиновников не идет в сравнение с легитимностью феодалов. И все же, в сравнении с моделью Вебера, развитие бюрократического аппарата Беларуси после 1994 года выглядит пародией на монархическую централизацию в той же Франции или в Московии Ивана Грозного.

ПОТЕШНАЯ АРИСТОКРАТИЯ

После крушения СССР старая партноменклатура стала единоличным владельцем белорусской госсобственности. Именно она, а не националистическая и прочая оппозиция была главной, реальной угрозой президенту Лукашенко в борьбе за власть.

Легитимно получив президентский пост и соответствующие ему возможности, Александр Лукашенко занялся перераспределением государственных ресурсов. Вместо старых номенклатурных магнатов советского разлива был призван номенклатурщик районного уровня. Новопризванная чиновная элита, взамен мелкопоместного воеводства, получала более высокое положение в новой бюрократической вертикали.

Монархи ограничивали власть родовой аристократии, насаждая централизованную администрацию. Президент Лукашенко усмирял самодостаточный госаппарат с помощью все того же аппарата. То есть, бюрократию бюрократией попирая.

Менялись люди, но не принципы воспроизводства системы. В неизменности все те же отсутствие общественного контроля за государственной властью, единство власти-собственности, круговая порука и компенсация суровости наказаний необязательностью их исполнения.

Со временем в аппарате, не имеющем себе реальных противовесов кроме себя самого же, возникают кланы и вотчины. Чем выше бюрократия — тем более в ней становится от этакой пародийной, потешной аристократии. Тем более в ней примет старой, своевольной партноменклатуры предпрезидентской поры.

Окончание на стр. 2 ➲

НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ

Мясцовы кандыдат Гаравы

Мы зноў задаем тры нашыя традыцыйныя пытанні будучым дэпутатам мясцовых саветаў. На гэты раз на іх адказвае Леанід Гаравы, кандыдат у дэпутаты Віцебскага абласавета па Гарадоцкай выбарчай акрузе №8.

Леанід Гаравы нарадзіўся ў 1959 годзе ў Гарадку Віцебскай вобласці. Скончыў матэматычны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута. З 1982 года працаваў на Дзяржыншчыне: ад настаўніка да дырэктара сярэдняй школы. З 1987 года дырэктар Вархоўскай БШ Гарадоцкага раёна. Актывіст дэмакратычнага руху з 1989 года. Па перакананнях – сацыял-дэмакрат. Шмат намаганняў прыкладае ў развіцці беларушчыны: ініцыятар правядзення літаратурна-краязнаўчых чытанняў па паэме «Тарас на Парнасе», конкурсаў «Рупліўца роднага слова», «З песняй жыве народ», сустрэчаў з беларускімі пісьменнікамі, выдання краязнаўчых брашур.

Заканчэнне на стар. 3 ➲

СПАДЧЫНА

XX стагоддзе ў скручанным рулоне

НАТАША СЯРГЕЕВА

Цікава ведаць, дзе зараз захоўваецца знакаміты «Габелен стагоддзя».

Пасля смерці Аляксандра Кішчанкі прайшло ўжо больш за пяць гадоў. У яго майстэрні на вуліцы Сурганава, дзе віравала творчае жыццё, сёння ціха. Там жывуць творы мастака – іх засталося ў спадчыну жонцы Ніне каля чатырохсот. Гэта жывапіс, габелены, алоўкавыя накіды, акварэлі, ад студэнцкіх да прац сталага майстра, многія з якіх не бачыў мінскі глядач. Там жа захоўваецца ў скручаным рулоне і знакаміты «Габелен стагоддзя», які, на жаль, стаў сёння вялікім галаўным болем і праблемай для ўдавы мастака. Апошнімі значнымі творамі мастака Кішчанкі былі габелен «Чарнобыль» і «Габелен стагоддзя». Чарнобыльскі габелен адразу знайшоў сваё месца – ён быў падораны дзяржаваю ААН. «Габелен стагоддзя» так і застаўся дасюль беспрытульны.

Над «Габеленам стагоддзя» Аляксандр Кішчанка працаваў з дапамогай калектыву ткачых з Барысаўскага мастацка-вытворчага камбіната больш за пяць гадоў. Габелен увайшоў нават у кнігу Гінеса як самы вялікі ў свеце прыклад ручнога ткацтва. Яго даўжыня складае 19 метраў. Зроблены ён з ваўняных нітак.

Габелен задумваўся і атрымаўся тыпова кішчанаўскі: з пранізліва яркімі колерамі, з дакладнай структурай, з філасофскім падтэкстам. Мастак уключыў у яго больш за семдзесят фігур знакамітасцяў XX стагоддзя. Гэта дзеячы навукі, культуры, палітыкі. На самым версе знаходзіцца і партрэт першага прэзідэнта Беларусі. Пад час прэзентацый такая трактоўка мастака выклікала многа пярэчанняў і пытанняў. Аляксандр Кішчанка ніколі не ўступаў у дыскусіі з аўтарамі крытычных артыкулаў. Ён лічыў для сябе неабходным адгукнуцца на ўвядзенне ў Беларусі інстытуту прэзідэнта. Адбылося выбранне першага прэзідэнта якраз у час заканчэння габелена, і мастаку засталося месца для яго партрэта толькі наверсе.

Але нават аблічча Александра Лукашенкі не паўплывала станоўча на далейшы лёс «Габелена стагоддзя». Вывешваўся ён некалькі разоў. Два разы пры жыцці мастака і адзін раз адразу пасля смерці адбылася прэзентацыя ў выставачным цэнтры ЭКСПО, дзе вышыні будынка хапіла, каб разгарнуць габелен, але ніжні яго край сцяліўся па падлозе.

Больш за два гады таму вывешваўся габелен на сцэне Палаца рэспублікі пад час візітаў прэзідэнтаў СНД. Тады Ніне з сябрамі ўдалося вычысціць і выбіць габелен, пракласці яго антымолевымі рэчывамі, пасля скруціць і заматаць тканінай. З таго дня ніводнага разу габелен не быў раскладзены, што выклікае ў сям'і мастака шмат турбаванняў. Балюча назіраць, заходзячы ў майстэрню да Ніны Уладзіміраўны, за незаўважным скруткам, нечакана невялікім па памерах, які на самой справе захоўвае адзін з найлепшых твораў беларускага мастацтва.

Сёння габелен належыць тром уласнікам: сям'і мастака і двум прыватным прадпрыемствам, якія плацілі за матэрыялы, памяшканні, працу барысаўскіх

Заканчэнне на стар. 6 ➲

АНЕКДОТ-С

Да здравствует белорусский народ – строитель национальной библиотеки!

***

– Правда, что в Беларуси в 2006 году будут президентские выборы?

– Нет, не правда, вместо выборов решено построить библиотеку.

***

– Для чего в Беларуси строят библиотеку?

– В основном для хранения политкниг, сданных в макулатуру в советские времена в обмен на «Трех мушкетеров» и «Королеву Марго».

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ



«Деревню «пронесло». Теперь в Гусевицах ищут виноватых»

(С. Гордиенко, «Советская Белоруссия», 12.02.03)



«Констиуция Республики Беларусь закрепляет качественно новый уровень отношений между личностью и государством»

(Г. Василевич, послание Конституционного суда, 5.02.03)



«Важна забяспечыць выдачу «спецыяльных лекаў – заработнай платы»

(В. Фёдараў, «Рэспубліка», 12.02.03)

НАВІНЫ

Галадоўка. Да Змітра Іваноўскага, які дванаццатыя суткі трымае галадоўку пратэсту ў спецпрыёмніку Кастрычніцкага РАУС Гродна, не пускаюць адваката. Скаргу з патрабаваннем адмены адміністратыўнага арышту ў дачыненні да гродзенскага мастака Змітра Іваноўскага ў абласны суд падаў прадстаўнік Іваноўскага – старшыня абласнога аддзялення БХК Аляксандр Антанюк. Тэкст скаргі Антанюк не змог узгадніць са сваім даверанікам. Начальнік Кастрычніцкага РАУС Генадзь Хацько адмовіўся пусціць Антанюка да Змітра Іваноўскага. Мастак быў асуджаны на 15 сутак адміністратыўнага арышту па абвінавачанні ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу прадпрымальнікаў ля будынка аблвыканкама ў канцы студзеня.

Заказнік. Стварэнне дзяржаўнага ландшафнага заказніка рэспубліканскага прызначэння «Прыбугскае Палессе» агульнай плошчай 7 тысяч гектараў пачнецца сёлета на тэрыторыі Брэсцкага раёна, які мяжуе з Украінай і Польшчай. Ініцыятыва стварэння заказніка належыць беларускім навукоўцам і іх калегам з суседніх краінаў. У заказніку ёсць 20 відаў раслінаў, якія занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі, у тым ліку унікальныя: каралеўская папараць, беларуская архідэя, вянерына пантофелька. На тэрыторыі будучага заказніка жывуць 40 відаў жывёлаў, якія таксама занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі.

Фэст. 18 лютага ў Мінску адбудзецца адкрыццё фестывалю дакументальнага кіно «Адзіны свет», які ладзіцца фундацыямі *People in Need, Czech TV Foundation* і грамадскім аб'яднаннем «Сфера». У праграме фестывалю 11 фільмаў, якія прысвечаны змаганню за свабоду і правы чалавека ў розных краінах свету. На фестывалі будзе прадстаўлены беларускі фільм «Дарога на Курапаты». Прагляд стужак адбудзецца 18 лютага па адрасе: Мінск, вуліца Варвашэні, 8. Пачатак а 18 гадзіне.

Звальненні. Звольнены з працы ў прадпрыемстве няведамаснай аховы Алег Кавалеўскі, старшыня Аршанскай гарадской арганізацыі Маладых сацыял-дэмакратаў і сябра Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі, які вылучаецца ў кандыдаты па Аршанскай гарадской акрузе №16. Прычынай звальнення стала палітычная дзейнасць 26-гадовага хлопца. Паводле ягоных словаў, у прыватнай размове яго кіраўнік паведаміў, што прычына звальнення – сяброўства ў БСДП. Кандыдат быў вымушаны сысці з працы. Ён мае намер падаць скаргу ў суд.

Беспрацоўе. На 1 лютага ў Беларусі на ўліку па беспрацоўі ў дзяржаўнай службе занятасці насельніцтва былі зарэгістраваныя 137,4 тысячы чалавек. З іх амаль кожны другі – з выплатаю дапамогі. Як паведамілі ў Дэпартаменце па занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, сярод зарэгістраваных у студзені беспрацоўных 2,5 тысячы чалавек, вызваленых з папярэдняга месца працы па скарачэнні штатаў або ў сувязі з ліквідацыяй прадпрыемства. Узровень беспрацоўя ў краіне на 1 лютага павялічыўся на 3,1 адсотка ад эканамічна актыўнага насельніцтва.

Радыяцыя. У Беларусі звыш 1,5 мільёна чалавек дагэтуль пражывае на тэрыторыі з забруджаннем радыяцыйным цэзіем-137 звыш 37 кілабекерэляў на 1 квадратны метр. На гэтай тэрыторыі знаходзяцца каля 2800 паселішчаў. Гэтыя дадзеныя агучыў старшыня Камітэта па праблемах наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС пры Радзе міністраў Уладзімір Цалко пад час выступу на міжнародным форуме па Чарнобылі, які адбыўся ў Вене ў штаб-кватэры МАГАТЭ.

Цэнтр. «*Пытанне стварэння адзінага эмісійнага цэнтра застаецца адкрытым*», – паведаміў прэс-сакратар Нацбанка Міхаіл Журавовіч. Ён заявіў, што на мінулым паседжанні Міжбанкаўскай валютнай рады ў Яраслаўлі мадэль стварэння адзінага эмісійнага цэнтра не была ўзгодненая. Між тым, міністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын паведаміў расійскім медыям, што бакі прыйшлі да згоды ў стварэнні адзінага эмісійнага цэнтра саюзнай дзяржавы на базе Цэнтрабанка РФ.

Энергія. Мінскія ЖЭСы пачалі адключаць даўжнікам цяпло ды электрычнасць. Гэтак, у Завадскім раёне сталіцы ад цеплазабеспячэння былі адключаныя больш як 200 кватэр злосных неплацельшчыкаў. Усяго ў раёне шматмесяцавыя пазыкі за камунальныя паслугі маюць каля 7000 уладальнікаў кватэраў. Карныя меры далі плён: сотні гаспадароў тэрмінова разлічыліся за спажытыя рэсурсы.

Даходы. Выручку прыватных прадпрымальнікаў дазволена прымаць праз абменныя пункты камерцыйных банкаў – адпаведнае распараджэнне выдаў Нацбанк. Прадпрымальнікі цяпер могуць атрыманыя грошы мяняць на валюту або залічваць на свае разліковыя рахункі.

Інвестыцыі. Першай сярод страхавых кампаній Цэнтральнай Еўропы на беларускі рынак выходзіць аўстрыйская страхавая група *Wiener Stadtiche*. Група выкупіла ў польскай кампаніі *Compensa S.A.* 33 адсоткі акцыяў беларускага страхавога таварыства «Купала». Заходнія інвестары маюць намер укараніць на беларускім рынку свае тэхналогіі страхавання ды кіравання. На гэты час аб'ём страхавых выплатаў на Беларусі не перавышаюць 6,5 еўра, у той час як у постсацыялістычных краінах Еўропы яны наблізіліся да 100 еўра, а ў краінах Еўразвязу —1500 еўра. Аўстрыйскіх інвестараў не палохаюць ні нізкія даходы беларусаў, ні асаблівасці нацыянальнага заканадаўства, якія не спрыяюць развіццю страхавой справы.

Бібліятэка. Геолагі выявілі на месцы пабудовы новай Нацыянальнай бібліятэкі затарфаваны пласт глебы таўшчынёй ад 1 да 2 метраў. Распрацоўкай архітэктурнага праекту бібліятэкі займалася унітарнае прадпрыемства «Мінскпраект». Галоўны інжынер прадпрыемства Уладзіслаў Бушынскі, грунтуючыся на разліках спецыялістаў, сцвярджае, што ціск новага будынку на затарфаваны слой не будзе перавышаць прыродны.

14 ЛЮТАГА

Акцыя любові-7

АЛЕСЯ ГОРДЗІНА

Мінскія ўлады адмовілі моладзі ў правядзенні акцыі на Дзень закаханых. Але хлопцы і дзяўчаты прыйдуць 14 лютага на традыцыйнае ў гэты дзень месца збору — плошчу Якуба Коласа, а 17-й гадзіне.

Ладзіць святкаванне нязменны арганізатар – Малады фронт. Менавіта ён правёў акцыю першы раз у 1997 годзе, яму належыць і далейшая раскрутка. Адна з самых гучных імпрэзаў адбылася ў 1999 годзе. *«Каля 300 адчайных маладых людзей пад кіраўніцтвам Яўгена Скочкі прайшліся па амбасадах, і каля прыбалтыйскіх амбасадаў Яўген бабахнуў 30 кілаграмаў піратэхнікі,* – нагадаў лідэр МФ Павел Севярынец. – *Фантан быў, канешне, выключны: салют на ўвесь горад. Бачыў нават суддзя, які потым судзіў Скочку і даў яму год умоўна. Міліцыянты павыбягалі з райаддзелаў са зброяй. Ну і адпаведны быў разгон».* Арганізатары абяцаюць, што і сёлетняе шэсце будзе яркім, відовішчным і карнавальным.

Маладафронтаўцы спадзяваліся, што ўлады пойдуць на «мяккі варыянт» – прапануюць унесці карэктывы ў маршрут шэсця. Але атрымалі адмову. *«Яна тым больш дзіўная, што мы два тыдні спрабавалі напрасіцца на разгляд,* – адзначыў Павел Севярынец. – *Нам казалі: усё добра, заяўка будзе разгледжана, мы вам паведамім».* Адмова ж палягае ў «*няправільным*» афармленні дакумента – заяўнікі не пазначылі свайго месца працы. Але кіраўнік Маладога фронту прадэманстраваў журналістам бланк, на якім падавалася заяўка на мінулагоднюю акцыю 17 лістапада і які МФ узяў за ўзор. Там заяўнікі таксама не ўказалі, дзе працуюць, але гэта не перашкодзіла ўладам даць дазвол на правядзенне шэсця.

Маладафронтаўцы будуць працягваць спробы дамовіцца з гарвыканкамам. Хаця з шасці акцыяў любові ўлады давалі дазвол МФ толькі два разы – у 1998 і 2000 гадах. Тым не менш, усе астатнія чатыры святкаванні моладзь адзначала і без санкцыянавання. Павел Севярынец параіў задумацца старшыні райвыканкама Паўлаву над прэцэдэнтам з яго папярэднікам: *«У 2000 годзе Ярмошын дазволіў акцыю любові, яна прайшла мірна. І праз тыдзень пасля гэтага стаў прэм'ер-міністрам».*

Акцыя-2003 пройдзе пад дэвізам «Люблю Беларусь!» і стане адказам моладзі на пагрозы незалежнасці Беларусі. Раніцай 14 лютага маладафронтаўцы абыдуць амбасады, прадстаўніцтвы АБСЕ і ААН і павіншуюць замежных супрацоўнікаў і іх краіны з Днём закаханых. Акрама таго, еўрапейскім прадстаўніцтвам будуць уручаныя два адмысловыя пасланні. Першае – зварот аб жаданні моладзі далучыцца да Еўропы і, адпаведна, просьба не будаваць жалезныя заслоны з Беларуссю. Другое пасланне – падтрымаць вылучэнне на Нобелеўскую прэмію кубінскага апазіцыянера Асвальда Пайя. Знакаміты дысідэнт, як зазначыў Павел Севярынец, з'яўляецца лідэрам руху «Хрысціянскае абуджэнне», змагаецца з камуністычным рэжымам на Кубе і дамагаецца правядзення рэферэндуму па ўвядзенні дэмакратычных правоў і свабодаў у гэтай краіне. *«Па шчырасці, даводзіцца сказаць, што калі ўжо ніхто з нашых апазіцыйных лідэраў не варты, дык вылучым кубінца»,* – патлумачыў Павел Севярынец. Вылучэння гэтай кандыдатуры дамагаюцца прыхільнікі і ў іншых краінах. Малады фронт, як было заяўлена, прыме ў гэтай справе чынны ўдзел.

Сёлетняя акцыя МФ пройдзе ў 32 гарадах Беларусі. *«Для нас гэта не свята разбэшчанасці, прэзерватываў, масавых пацалункаў, а ў першую чаргу свята любові ў найвышэйшым сэнсе,* – давёў кіраўнік МФ. – *Таму хрысціянскі акцэнт таксама будзе адлюстроўвацца. Мы плануем раздаваць сардэчкі з цытатамі з Бібліі пра любоў, і ў гэтым мы бачым сур'ёзны сэнс».*

Сярод рупліўцаў узвышанай любові ёсць ужо і першыя ахвяры. Як паведамілі маладафронтаўцы, у сталіцы на Партызанскім праспекце міліцыянты жорстка збілі нагамі 18-гадовага навучэнца ПТВ за расклейку ўлётак да акцыі. Не затрымоўвалі, не складалі пратаколу, і пакінулі хлопца валяцца на снезе.

«Калі рэжым захацеў сапсаваць нам свята і паспрабуе разагнаць удзельнікаў акцыі, то гэты рэжым чакае вельмі гарачая вясна», – заявіў Павел Севярынец. ■

ПОЛИТЭКОНОМИКА

Разборка с правительством

АНАСТАСИЯ РАКОВИЧ

Казалось бы, экономические итоги 2002 года подвели еще неделю назад, на заседании президиума Совмина. Так вот нет, глава государства, как тот булгаковский персонаж, все равно «*разобраться хочет*». И разбирается по-своему.

Александра Лукашенко снова весьма интересовало состояние дел в сельском хозяйстве, а именно почему агропромышленный комплекс не выполнил прогнозные показатели. Темп роста продукции сельского хозяйства составил только 101,5 процента при задании 103-104 процента. Возмутило президента то, что в Беларуси стало туго со «вторым хлебом». Если в советский период валовой сбор картофеля в общественном секторе достигал шести миллионов тонн (при общем производстве 10-11 миллионов), то в 2002 году в хозяйствах он составил лишь 600 тысяч тонн. Даже по сравнению с 2001 годом производство снизилось на 26 процентов. Из-за этого, подчеркнул Александр Лукашенко, пришлось завозить более шести тысяч тонн картофеля из-за границы.

Еще одна проблема, которую выделил президент Лукашенко, – финансовое состояние агропромышленного комплекса. В стране убыточными являются более 60 процентов хозяйств. В связи с этим главу государства интересовало, как происходит преобразование убыточных совхозов и колхозов и какова эффективность работы уже реформированных хозяйств. Как известно, ничто не возникает на пустом месте, должна созреть почва для определенных решений. То, что Лукашенко заговорил о проблемах сельского хозяйства, может сигнализировать, что вскоре за эти самые проблемы возьмутся всерьез. Только вот с какого конца?

Существенная либерализация рынка сельхозпродукции произошла – цены на нее отпустили. Какой шаг последует за этим? Неужели глава государства решился на реформирование АПК, и колхозы будут распущены? У государства нет иного выхода, кроме как постепенно сбрасывать балласт. Потому и зазвучали фразы о «*новых помещиках*», которые могут спасти положение там, где довели дело до ручки колхозные председатели.

Любопытен еще один тезис из выступления Александра Лукашенко от 11 февраля: в экономику нельзя допускать криминал – ни отечественный, ни зарубежный. Поэтому особого внимания требует такой фактор оздоровления экономики, как прозрачность товарно-денежных потоков и экспортно-импортных операций. В общем, все это в русле тех тенденций, которые уже наблюдались в предыдущие недели: несколько совещаний по вопросам внешней торговли, заявления о том, что экспорт и импорт отдельных видов товаров нужно отдать под контроль управделами президента и прочая. Словом, пиявкам-посредникам объявили войну. *«Мною ставилась задача убрать посреднические звенья, «теневые» схемы, чтобы предприятия напрямую торговали, получали сырье, реализовывали продукцию»,* – напомнил белорусский президент.

Касаясь вопроса о невыполнении прогнозного показателя по внутренним инвестициям, руководитель страны помянул банки. «*Кровеносная система страны*», – так патетично именуют банковскую систему с высоких трибун. Сказано было также, что она является «*действенным рычагом в инвестировании реального сектора экономики*». Лукашенко в связи с этим интересовал вопрос: почему оборотные средства руководители предприятий по-прежнему ищут у посредников, а не берут банковские кредиты, что изменилось за год во взаимоотношениях банковской сферы и реального сектора экономики?

Белорусские банкиры это уже проходили. Если сам руководитель страны упомянул их, значит, доведется опять отдавать деньги по первому требованию, заранее зная, что добрая половина кредитов не вернется. «*У банков и взять уже особо нечего,* – сказал в интервью БелаПАН известный экономист Валерий Дашкевич. – *Единственный способ их наполнить – это привлекать вклады населения под высокие процентные ставки. Но если банки вынудят давать кредиты под различные государственные проекты, возникнет угроза невозврата вкладов*».

При этом президент отдал приказ «*ни шагу вперед*» – в смысле цен. Понятно, приказ невыполним. Даже официальные прогнозы предусматривают инфляцию. Может, следующим шагом станет установка «открутить цены назад»? Но это было еще в бытность вице-премьером Виктора Гончара. С тех пор Беларусь уверенно лидирует по инфляции во всем СНГ. ■

БЕЛОРУССКИЕ ВОПРОСЫ

Суррогат феодализма

Окончание. Начало на стр. 1

И вот вместо безотказной машины исполнительной власти получается система чиновных уделов. И управляться с такой приходится по-феодальному. Короли рубили головы зарвавшимся баронам. Белорусских потешных аристократов приходится сажать, держать на коротком поводке угрозой уголовного преследования, тасовать и перемешивать из министров да в академики.


Но назначение чиновников на ответственные посты превращается в жалование титулов и владений. В авторитарной белорусской системе, где бюрократия уравновешивает сама себя, аппарат утрачивает рациональные черты веберовского идеала. Суррогат монархии без диктатуры закона порождает суррогат феодализма. ■

НАВСТРЕЧУ ВЫБОРАМ

Местный кандидат Шпаковский

Михаил Николаевич Шпаковский родился в 1953 году в городском поселке Яновичи Витебского района. В 1971–1974 годах проходил службу на Балтийском флоте. Работал токарем на заводе заточных станков в Витебске. Сейчас помощник машиниста тепловоза Витебского локомотивного депо. Белорус, женат.

КАНДИДАТ В ДЕПУТАТЫ ГОРСОВЕТА ПО ЛОКОМОТИВНОМУ ОКРУГУ № 38 ВИТЕБСКА



— Что вы собираетесь делать в местном совете, не обладающем достаточными полномочиями?

— Я ходил вместе со сборщиками подписей, разговаривал со многими людьми. В основном, всех интересуют проблемы местного значения. Политические стоят не на первом и даже не на втором месте. Хотя, конечно, некоторых интересуют и политические взгляды кандидата. Люди говорят: нам главное – чтобы депутат работал, что-то делал. А то не видим наших депутатов. Как только проголосуем, они неизвестно куда пропадают. Поэтому надо повернуть власть к народу. Если хотя бы процентов десять мест в советах будет принадлежать депутатам демократических взглядов, можно шевелить Национальное собрание насчет закона о местном самоуправлении. Чтобы власть принадлежала городскому совету, а не исполкому. Чтобы можно было отзывать чиновников, которые не выполняют свои обязанности. Городской бюджет должен формироваться с отчислений части налогов предприятий, находящихся на территории города. Жизненно важные решения надо принимать на общегородском референдуме. Иначе власть будет работать только сама на себя.

— Какие проблемы будете решать, если станете депутатом?

— В Витебске остро стоит вопрос плохой работы транспорта. Нужно пытаться решать эти проблемы. Транспорта немного, и на ремонт выделяется мало средств. А микроавтобусы и такси для многих дорогое удовольствие. Поэтому считаю необходимым на уровне горсовета пробивать эту проблему.

— А какие проблемы своего округа будете решать в первую очередь?

— Улицы необорудованы тротуарами. Например, улица Леонова, четная сторона Локомотивной. Буду добиваться, чтобы убрали автостоянку по улице Титова возле домов 12, 14, 16. Невозможно ни отдохнуть, ни детям поиграть. Мазут, мусор постоянно. И в районе Полоцкого рынка, где я живу, мусор подолгу не убирается. Лежит вокруг рынка, настоящий рассадник инфекции, особенно летом.

В частном секторе – проблема несвоевременного ремонта улиц. По несколько лет не ремонтируются, сплошные ухабы. Свалки на улицах. Вот эти проблемы надо решать сегодняшним кандидатам, которые станут депутатами горсовета.

— Как будете строить отношения с исполнительной властью, если станете депутатом?

— Проблемы с представителями исполнительной власти, думаю, будут. Причем сразу, если требовать от них выполнять свои обязанности и решать проблемы. Надеюсь, это получится, там тоже люди работают. Но они очень зависимы от вышестоящей власти. ■

НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ



Мясцовы кандыдат Гаравы

Заканчэнне. Пачатак на стар. 1

— Мясцовыя саветы пры сённяшнім рэжыме пазбаўлены рэальных паўнамоцтваў. Што вы зможаце зрабіць у іх рамках?

— Пры ўсёй дэкаратыўнасці мясцовай прадстаўнічай улады, галоўнае – як дэпутаты ставяцца да сваіх паўнамоцтваў, да сваіх абавязкаў. Калі яны для дэпутатаў ад улады толькі дадатак да службовай або кіруючай пасады, то і паўнамоцтвы рэалізуюцца мінімальна.

А калі казаць дакладна, то абраныя ў 1999 годзе саветы маўкліва штампавалі згоду амаль на ўсе рашэнні мясцовых адміністрацый. Цяжка ўзгадаць прыклады, каб мясцовыя саветы не пагадзіліся з прапановамі ад выканкамаў, якімі б супярэчлівымі яны ні былі, як бы ні парушалі дзеючае заканадаўства.

У межах ужо існуючых паўнамоцтваў магчыма адказна ставіцца да планавання сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна, вобласці – рабіць грамадскую экспертызу такіх праектаў.

Дэпутаты маюць магчымасць больш адказна адносіцца да кантролю за выкарыстаннем бюджэтаў, выкарыстаннем народных грошаў. Чаму б ім не абмеркаваць мэтазгоднасць набыцця шыкоўных «Мерседэсаў» пры агульнай галечы бюджэтных арганізацый адукацыі і культуры?

Карацей кажучы, паўнамоцтвы выкарыстоўвае той, хто жадае, хто адказны перад выбаршчыкамі.

— Якія канкрэтныя праблемы вашай акругі збіраецеся вырашыць, калі будзеце абраны дэпутатам?

Праблемы, якія існуюць у Гарадоцкай акрузе, характэрны не толькі для Гарадка, але і для іншых рэгіёнаў, для ўсёй краіны. Галоўная праблема зараз для ўсіх выбаршчыкаў – рэзкі рост кошту камунальных паслуг, які значна апярэджвае рост заробкаў. На мясцовым узроўні падвышэнне кошту паслуг рэгуляваць немагчыма, але для жыхароў вельмі важна, каб у кватэрах было цёпла, вада была гарачай.

Між тым даволі часта камунальнікі ў кошт сваіх паслуг уключаюць усе выдаткі сваёй арганізацыі, не вельмі клапоцячыся, каб цеплатрасы грэлі кватэры, а не навакольнае паветра. Часам спажыўцы вымушаны аплачваць еўражыццё цеплаэнергецікаў: еўраабсталяванне прыёмных, кабінетаў, саун і гэтак далей.

Жыхары павінны добра ведаць, з чаго складаецца кошт дарагіх камунальных паслуг, а дэпутаты мусяць бараніць права выбаршчыкаў плаціць толькі за цеплату, а не холад.

Спецыфічнай праблемай акругі стала рэканструкцыя цэнтральнага маста ў Гарадку, закрыццё якога рассекла райцэнтр на дзве часткі, стварыла шматлікія праблемы ў жыхароў Гарадка і раёна. Мясцовыя ўлады раёна, вобласці своечасова не паклапаціліся аб рамонце суседняга маста для аб'езду і зараз ад закрыцця маста пакутуе амаль палова жыхароў Гарадка.

Калі кіраўнік будаўнічай дарожнай арганізацыі кажа аб магчымасці завяршэння рамонту да 1 верасня, то грамадскасць раёна мае права ведаць штотыднёвы графік вядзення рамонтных работ на мосце, не кажучы аб своечасовасці фінансавання гэтых работ.

Для мяне таксама важным з'яўляецца пытанне фінансавання сістэмы адукацыі. Папершае, безумоўна, настаўніцтва павінна своечасова атрымліваць за сваю працу ва ўмовах перманентнага рэфармавання годны заробак – не ніжэй, чым у прамысловасці, а таксама абяцаныя ўладамі даплаты. І рабіца гэта павінна не толькі перад выбарамі.

Па-другое, у буйных гарадах лягчэй знайсці спонсараў, фундатараў для школ, большыя магчымасці ў прадпрыемстваў, а ў правінцыі іх амаль няма.

Але вясковыя дзеці маюць такое ж права на якасную адукацыю, што і гарадскія. Толькі за апошняе дзесяцігоддзе сродкі ўкладваліся ў будаўніцтва лядовых палацаў, манежаў, розных базараў і фестываляў, а не ў матэрыяльную базу сельскіх школ, якая звязана з вучэбна-выхаваўчым працэсам: набыццё сучаснай камп'ютэрнай тэхнікі, спартыўнага абсталявання, мэблі, дыдактычнай базы.

Шмат пытанняў выклікае ў грамадства і дзесяцібальная сістэма, і пяцідзённы вучэбны тыдзень, і рэзкія перагрузкі вучняў старэйшых класаў звычайных школ.

— Вашыя адносіны да ўлады, як збіраецеся будаваць з ёю адносіны?

У прыватных размовах мясцовыя кіраўнікі ў большасці – нармальныя партнёры. Але існуючая адміністратыўна-камандная сістэма не садзейнічае іх эфектыўнай працы, накладвае свой негатыўны адбітак на іх асабістыя якасці. Гэта сёння адчуваецца на ўсіх узроўнях.

Мяркую, што большасць супрацоўнікаў выканаўчай улады разумеюць тупіковасць сённяшняга развіцця Беларусі, але сказаць, хто ў нас «голы кароль», – яшчэ не гатовы. ■

ПО ПОВОДУ

Тотальное недоверие

АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ

Переходный характер белорусского общества и государства как нельзя лучше иллюстрируют социологические выкладки о том, насколько доверяют или не доверяют наши сограждане общественным и государственным институтам.

В декабрьском опросе НИСЭПИ мониторингу подверглись различные аспекты белорусского общественного мнения. Среди прочего, 1478 респондентов, опрошенных методом *face to face* интервью, отвечали на вопросы о доверии и недоверии к политикам, государственным и общественным институтам.

По-прежнему наибольшей степенью доверия белорусов пользуются православная церковь, армия и наука. Именно всебелорусским уважением к науке объясняется высокий рейтинг доверия государственным и негосударственным исследовательским центрам.

Гораздо сложнее интерпретировать мнение 65,7 процента опрошенных, безоглядно доверяющих православной церкви. Руководитель НИСЭПИ Олег Манаев объясняет запредельный рейтинг доверия РПЦ, в сравнении с другими белорусскими институциями, тем фактом, что «*сторонниками православной конфессии считают себя 72,6 процента взрослого населения*».

Хотя, возможно, церковный ларчик открывается проще. Ведь особого роста религиозности у белорусов не наблюдается. Даже о православном фундаментализме на Беларуси что-то не слыхать.

По выходным никакого наплыва белорусских прихожан в храмы не наблюдается. То же самое и по двунадесятым праздникам, за исключением Рождества Христова и, особенно, Пасхи. Количество венчающихся по-прежнему меньше тех молодоженов, кто ограничивается казенной записью гражданского состояния. Чуть больше совершается обрядов отпевания, но крещение младенцев вообще не считается обязательным обрядом.

По всей видимости, высокий рейтинг доверия РПЦ, которой не доверяют лишь 22,4 процента респондентов НИСЭПИ, имеет своим происхождением невоцерковленность белорусов и обычный страх нерелигиозных людей перед нематериальным миром. Доверяют РПЦ на всякий случай, как бы чего не вышло.

В доказательство также можно привести высокий уровень доверия к католической церкви – 32,9 процента. Тогда как конфессиональных католиков у нас насчитывается в три раза меньше. А вот незначительность доверия к протестантской церкви (13,4) только подтверждает правило. Как можно доверять всяким сектантам-диссидентам? И ведь это далеко не по религиозным мотивам.

Той же отстраненностью большинства можно истолковать и доверие 49,8 процента к такому государственному институту, как армия. Слишком невелик ныне призывной контингент, а несколько десятков тысяч профессиональных военных никак не влияют на формирование общественного мнения.

Большинство белорусов столь же далеки от армейских проблем, как и от церковно-религиозной жизни. А отсутствие публичного негатива заставляет верить в исключительную позитивность данной институции. Отсюда проистекает и благорасположенность к армии.

Совершенно иную картину недоверия мы наблюдаем, когда приходится интерпретировать показатели государственных и общественных институтов, находящихся намного ближе к респондентам. Скажем, в белорусских городах и весях гораздо чаще можно встретить милицейскую униформу, чем армейский мундир. Не говоря уже о том, какова роль органов правопорядка в повседневной жизни большинства наших сограждан.

Тут даже 63,4 процента, напрочь не доверяющих милиции, не кажется слишком большой цифрой. А 24,6 процента все-таки доверяющих респондентов либо имели редкий положительный опыт общения со служителями правопорядка, либо в милиции служат они сами или их родственники и знакомые. Последний довод немаловажен, поскольку численность правоохранителей в белорусском государстве велика есть.


Столь же близки сердцу рядового белоруса и местные органы власти, с которыми тоже приходится сталкиваться очень часто. К примеру, исполкомам не доверяют 58,7 процента, а отождествляемым с ними местным совдепам – 59,8. Не приходится сомневаться, что самой одиозной белорусской институцией были бы жилищно-коммунальные конторы, если бы кто-то поинтересовался общественным мнением по этому поводу.

Чем дальше и выше от белорусов располагается тот или иной государственный и общественный институт, тем меньше число тех, кто ему не доверяет. Так, оппозиционным политическим партиям не доверяет 55 процента. И далее по убывающей: суды – 54,9, правительство – 53,6, КГБ – 51,7, Нацсобрание – 50,7, президент Лукашенко – 48,3, ФПБ – 45,4, Конституционный суд – 43,9. Всем им, по данным НИСЭПИ, белорусское общественное мнение тотально не доверяет.


Чуть лучше дело обстоит с государственными и негосударственными средствами массовой информации. Им не доверяют 44,2 и 42,4 процента соответственно. Тогда как у 40,4 и 37,1 процента они пользуются соответствующим доверием.

Параллельно, всеобщее недоверие никому не мешает читать газеты и смотреть телевизор, обращаться, если что случится, за помощью в милицию и огромной массой голосовать на президентских и депутатских выборах. Будь то за кандидатов от власти или за представителей оппозиции.

Тотальное недоверие не означает ничего, кроме того, что белорусское общество и государство существуют отдельно от своих институтов. Эти параллельные миры иногда пересекаются, но чаще всего стоят особняком. Наверное, по-иному и быть не может в переходный период становления общества и его отделения от государства. ■



ДОВЕРЯЕТЕ ЛИ ВЫ ИМ?



ПОСТСАВЕЦКІЯ НАВІНЫ



Украіна. Прэзыдэнт Украіны Леанід Кучма падпісаў законапраект пра зьмены ў крымінальны і крымінальна-працэсуальны кодэксы, якія ўсталёўваюць пакараньне за адмываньне брудных грошаў. Прыняць гэты закон патрабавала Сусьветная арганізацыя па барацьбе з адмываньнем брудных грошаў, якая ў канцы мінулага году рэкамэндавала сваім краінам-сябрам увесьці санкцыі супраць Украіны як дзяржавы, якая спрыяе адмываньню незаконных даходаў.

Між тым сам Леанід Данілавіч можа спаць спакойна, таму што яго жорсткія пакараньні не закрануць. У Вярхоўнай радзе прыняты да разгляду законапраект пра пажыцьцёвыя гарантыі былым прэзыдэнтам Украіны. Закон прадугледжвае пажыцьцёвы імунітэт ад крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасьці ўсім былым прэзыдэнтам дзяржавы. Яны таксама змогуць ухіляцца ад уплаты падаткаў – законапраект асобна абумоўлівае, што за затойваньне сваіх даходаў былыя прэзыдэнты ня будуць несьці адказнасьці. Акрамя таго, былыя прэзыдэнты будуць мець права на пажыцьцёвае ўтрыманьне ў памеры 80 % ад сярэдняга заробку дзеючага прэзыдэнта. Усяго гэтага прэзыдэнта Украіны можна будзе пазбавіць толькі ў адным выпадку – калі ён будзе адхілены ад улады ў выніку імпічмэнту. Для Леаніда Кучмы прыняцьце гэтага законапраекту жыцьцёва важна – апазыцыя яго абвінавачвае ў зьдзяйсьненьні цэлага шэрагу злачынстваў, а пракуратура па рашэньню суда ўвосені мінулага году завозіла супраць яго крымінальную справу адразу па 13 артыкулах крымінальнага кодэксу. Аднак справа была хутка спынена рашэньнем генэральнага пракурора. Праз паўтара гады ва Украіне пройдуць выбары прэзыдэнта, і Леанід Кучма ўжо ня будзе мець права балятавацца на новы тэрмін.

